# РАДЗІМ ГАЎРЫЛАВІЧ ГАРЭЦКІ
# (07.12.1928 – 22.06.2025)



22 чэрвеня 2025 г. не стала Радзіма Гаўрылавіча Гарэцкага – акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, замежнага члена Расійскай акадэміі навук, доктара геолага-мінералагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі Расійскай АН імя акадэміка М. С. Шацкага і прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга.

Р. Г. Гарэцкі нарадзіўся ў Мінску 7 снежня 1928 г. Бацька Радзіма Гарэцкага Гаўрыла Іванавіч быў адным з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук, кіраваў геолага-інжынернымі пошукамі пад адказныя збудаванні, што надоўга прадвызначыла вандроўнае жыццё сям'і за межамі Беларусі і нялёгкае дзяцінства Радзіма Гаўрылавіча. Яму давялося вучыцца ў 13 школах у розных гарадах і пасёлках. У 1947 г. ён паступіў на геолагаразведачны факультэт Маскоўскага нафтавага інстытута імя І. М. Губкіна, а пасля заканчэння вучобы ў 1952 г. быў запрошаны А. Л. Яншыным на работу ў Геалагічны інстытут Акадэміі навук СССР (ГІН).

Першыя даследаванні Р. Г. Гарэцкага ў Заходнім Казахстане і Сярэдняй Азіі пад кіраўніцтвам акадэмікаў М. С. Шацкага і А. Л. Яншына дазволілі вырашыць некаторыя важныя пытанні агульнай і рэгіянальнай тэктонікі, стратыграфіі, палеанталогіі, літалогіі, геалогіі нафтавых і газавых радовішчаў. Разам з акадэмікам А. Л. Яншыным Р. Г. Гарэцкі зрабіў грунтоўны ўклад у развіццё метадаў тэктанічных даследаванняў. Вынікі гэтых даследаванняў апублікаваны ў сумеснай фундаментальнай працы «Тектонический анализ мощностей» (1960), у якой насуперак пануючым уяўленням сцвярджалася значнае пашырэнне ў геалагічным мінулым некампенсаванага прагінання, захаванасць старажытнага эразійнага рэльефу, глыбакаводных адкладаў.

1950–1960 гг. вызначыліся ў геалогіі сцвярджэннем парадыгмы новай глабальнай тэктонікі (тэктонікі пліт) і яе важнай часткі – вучэння аб маладых платформах. Радзім Гаўрылавіч асаблівую ўвагу ўдзяляў даследаванням маладых платформ. У 1969 г. ён атрымаў вучоную ступень доктара геолага-мінералагічных навук за працу «Тектоника молодых платформ Евразии», а ў 1972 г. выходзіць яго манаграфія з той жа назвай. У кнізе вылучаны асаблівасці геалагічнай будовы і развіцця маладых платформ як адметнай катэгорыі тэктанічных элементаў літасферы, і ў якасці тэктонатыпу выбрана Цэнтральна-Еўразійская платформа, а Туранская пліта – як тэктонатып маладых пліт. Даследаванне маладых платформ дазволіла выявіць тэктанічныя заканамернасці размяшчэння многіх карысных выкапняў, у тым ліку забяспечыла адкрыццё ў 1965 г. новага газаноснага раёна ў Прыараллі па рэкамендацыі Р. Г. Гарэцкага і яго калег.

У гэты ж час Р. Г. Гарэцкі ўдзельнічае ў рабоце па падрыхтоўцы матэрыялаў у некаторыя тамы «Геологии СССР». Асабліва складанай аказалася работа над XXI томам «Западный Казахстан». Разам з А. Л. Яншыным (рэдактар тома), В. С. Жураўлёвым, А. Е. Шлезінгерам, казахскімі геолагамі і іншымі калегамі ўпершыню была сістэматызавана ў дзвюх кнігах тома геалогія вялізнай тэрыторыі з разнастайнымі па геалагічнай будове раёнамі і пашыранымі ў іх пародамі ад дакембрыю да сучаснасці, з дадаткам «Геологической карты Западного Казахстана» м-бу 1: 500 000 (1970).

Стварэнне тэктанічных карт займала важнае месца ў рабоце Р. Г. Гарэцкага. У 1968–1975 гг. ён быў намеснікам старшыні рэдакцыйнай камісіі па апрабацыі і зацвярджэнні геолага-геафізічных карт нафтагазаносных раёнаў тэрыторыі СССР м-бу 1: 1 000 000. За ўдзел у стварэнні «Тектонической карты Евразии» (м-б 1: 5 000 000) і манаграфію «Тектоника Евразии» яму разам з іншымі вучонымі ГІНа на чале з А. Л. Яншыным у 1969 г. прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

За час работы ў ГІНе (1952–1971) у Радзіма Гаўрылавіча ў поўнай меры выявіўся і развіўся

талент вучонага і арганізатара. Працавітасць, звычка да напружанай работы, выдатныя веды па спецыяльнасці, адказнасць за давераную справу, добрасумленнасць і характар – лагодны ў адносінах з людзьмі, але цвёрды ў прынцыповых момантах – спрыялі поспехам і аўтарытэту ў калектыве.

У 1971 г. прэзідэнт АН БССР акадэмік М. А. Барысевіч запрашае Р. Г. Гарэцкага на работу ў Мінск, у Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, дзе ўжо працаваў яго бацька Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі. У снежні гэтага ж года Радзім Гаўрылавіч вяртаецца на радзіму і ўзначальвае створаны ў інстытуце аддзел агульнай і рэгіянальнай тэктонікі. У хуткім часе Р. Г. Гарэцкі становіцца прызнаным лідарам тэктанічнай школы Беларусі і Прыбалтыкі, што выявілася і ў рабоце арганізаванай ім камісіі па тэктоніцы Беларусі і Прыбалтыкі міжведамаснага тэктанічнага камітэта СССР (1972–1991). У 1972 г. Р. Г. Гарэцкі выбіраецца членам-карэспандэнтам АН БССР. Пад яго кіраўніцтвам разгарнулася работа па абагульненні велізарнага фактычнага матэрыялу па тэктоніцы, назапашанага геолагамі па тэрыторыі Беларусі, Прыбалтыкі і заходніх абласцей Расіі. У выніку ў 1976 г. была выдадзена «Тэктанічная карта Беларусі і сумежных тэрыторый» м-бу 1: 500 000 і апублікавана манаграфія «Тектоника Беларуси». Быў прапанаваны новы метад складання тэктанічных карт паводле раяніравання тэрыторыі па ўзросце галоўнага этапу фарміравання платформавых структур. За стварэнне «Тэктанічнай карты Беларусі і сумежных тэрыторый» і манаграфіі «Тектоника Беларуси» Р. Г. Гарэцкі з групай вучоных і геолагаў-практыкаў у 1978 г. быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Новы этап у навукова-арганізацыйнай дзейнасці Р. Г. Гарэцкага пачаўся з 1977 г., калі яго выбралі правадзейным членам (акадэмікам) АН БССР і ён быў назначаны дырэктарам Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР, якім кіраваў 16 гадоў, пакуль не стаў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі.

Важнае месца ў дзейнасці Р. Г. Гарэцкага займалі сумесныя праекты з замежнымі геолагамі, супрацоўніцтва з якімі ён пачаў яшчэ ў ГІНе з вывучэння палеазаід Еўразіі. Асабліва плённым такое супрацоўніцтва было ў 1975–1986 гг. па праекце № 86 Міжнароднай праграмы геалагічнай карэляцыі (МПГК) «Усходне-Еўрапейская платформа (паўднёва-заходні край)». Распрацоўка гэтай актуальнай праблемы патрабавала сінтэзу геалагічных матэрыялаў аб будове і развіцці велізарнай тэрыторыі Еўропы ў межах амаль 20 краін і тэктанічных структур ад бартоў Балтыйскай сінеклізы, Беларускай антэклізы, Украінскага шчыта і Дабруджы на ўсходзе да варысцыйскіх збудаванняў Сярэдняй Еўропы і каледанід Англіі на захадзе з акваторыяй Паўночнага мора ўключна. Р. Г. Гарэцкі – адзін з кіраўнікоў гэтага праекта – узначаліў даследаванні на тэрыторыі СССР і непасрэдна кіраваў тэктанічным напрамкам праекта. Адзін з асноўных вынікаў гэтай работы – складанне і выданне «Тэктанічнай карты паўднёва-заходняй ускраіны Усходне-Еўрапейскай платформы» м-бу 1: 1 500 000 (галоўны рэдактар Р. Г. Гарэцкі). Праведзеныя даследаванні далі магчымасць паглыбіць уяўленні аб тэктоніцы Еўропы і скласці комплекс літолага-палеагеаграфічных карт Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Развіваючы вучэнне аб платформах, Р. Г. Гарэцкі асаблівую ўвагу ўдзяляў галоўным структурам – аўлакагенам, сінеклізам, антэклізам, зонам перыкратонных апусканняў. У спецыяльных працах была выканана класіфікацыя сінекліз і антэкліз, раскрыты асаблівасці іх развіцця. Разам з С. В. Клушыным ён упершыню паказаў галоўную ролю лістрычных разломаў у будове і развіцці Прыпяцкага палеарыфта, а разам з іншымі калегамі – праблему лістрычнай тэктонікі платформ наогул. Вялікае значэнне вучоны надае інтэрпрэтацыі геафізічных матэрыялаў, вывучэнню глыбіннай будовы і геадынамікі платформ, іх сейсматэктанічнаму раяніраванню. Вынікам гэтых мэтанакіраваных даследаванняў стала выданне пры ўдзеле і навуковым рэдагаванні Р. Г. Гарэцкага шэрага манаграфій, сярод якіх «Тектоника Припятского прогиба» (1979), «Палеотектоника Белоруссии» (1983), «Геофлюидодинамика и нефтеобразование» (1997), «Геофизические поля и динамика тектоносферы» (2002) і інш.

Значныя практычныя вынікі даследавання маладых і старажытных платформ абумоўлены абгрунтаваннем на іх аснове навуковага прагнозу такіх карысных выкапняў, як нафта і газ, калійная і каменная солі, аалітавыя жалезныя руды, вугаль, падземныя пітныя воды і расолы і інш. У 1985 г. Прэзідыум АН СССР узнагародзіў Р. Г. Гарэцкага прэміяй імя акадэміка М. С. Шацкага за серыю работ па тэме «Тектоника осадочного чехла платформенных областей Евразии». У 2004 г. разам з калектывам вучоных Беларусі і Сібіры ён стаў лаўрэатам прэміі імя акадэміка В. А. Капцюга, прысуджанай Сібірскім аддзяленнем РАН і НАН Беларусі.

Вывучэнне Прыпяцкага саляноснага басейна сумесна з В. З. Кіслікам, Э. А. Высоцкім, Н. С. Пятровай і іншымі спецыялістамі дазволіла раскрыць заканамернасці распаўсюджвання, будовы, складу і ўтварэння дэвонскіх саляносных фармацый. Вынікі апублікаваны ў трох сумесных манаграфіях на гэтую тэму, у тым ліку ў кнізе «Калиеносные бассейны мира» (1988).

З калектывам беларускіх геолагаў Р. Г. Гарэцкі распрацаваў новае нафтагеалагічнае раяніраванне Прыпяцкага прагіну і абгрунтаваў асноўныя напрамкі нафтапошукавых работ, звяртаючы ўвагу на важнасць сейсмастратыграфічных метадаў лакальнага і занальнага прагназаў. Новыя метадычныя прыёмы пошукаў радовішчаў нафты, распрацаваныя ім з калегамі, былі абаронены пяццю аўтарскімі пасведчаннямі аб вынаходстве. Сумесна з геолагамі-нафтавікамі Беларусі, Літвы, Украіны ён удзельнічаў у падрыхтоўцы і публікацыі фундаментальнай манаграфіі «Геология и нефтегазоносность запада Восточно-Европейской платформы» (1997).

У 1990-х гг. Р. Г. Гарэцкі быў адным з лідараў буйных навуковых міжнародных праектаў Europrobe і Eurobridge, кіруючы савецкай, а пазней беларускай часткай. Па тэрыторыі Беларусі быў праведзены геатрансект з дэталёвымі комплекснымі геолага-геафізічнымі даследаваннямі па двух профілях: Варэна – Нясвіж – Выступовічы і Бабруйск – Лельчыцы. Для выяўлення глыбіннай будовы асабліва важным было сейсмічнае і магніта-тэлурычнае зандзіраванне. У выніку здабыты фундаментальныя веды аб структуры і эвалюцыі літасферы захаду Усходне-Еўрапейскай платформы.

Вывучэннем геалагічнай будовы зямной кары Беларусі і навакольнай тэрыторыі Р. Г. Гарэцкі працягваў займацца і далей. У рэалізаваным праекце «Геарыфт-2013» па напрамку Нясвіж – Брагін (Беларусь) – Чарнігаў – Палтава (Украіна) Р. Г. Гарэцкі ў складзе рабочай групы прымаў удзел у інтэрпрэтацыі атрыманых геафізічных вынікаў з тэктанічных пазіцый, што завяршылася стварэннем мадэлі глыбіннай будовы зямной кары да глыбіні 80 км. Гэтая мадэль з'яўляецца асновай для вывучэння геалагічных асаблівасцей палеарыфтавых структур Усходне-Еўрапейскай платформы.

У 1993 г. Р. Г. Гарэцкі быў членам беларускай дэлегацыі на Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў Парыжы, дзе выступіў з прапановай правесці даследаванне найноўшай геадынамікі Цэнтральнай Еўропы ў сувязі з праблемай паходжання катлавіны Балтыйскага мора. Ідэя была падтрымана і набыла статус праекта МПГК № 346 «Неагеадынаміка дэпрэсіі Балтыйскага мора і сумежных абласцей», кіраўнікамі якога былі Р. Г. Гарэцкі, Э. А. Ляўкоў (Беларусь) і Г. Шваб (Германія). У выніку даследаванняў па праекце (1994–1998) геолагамі Беларусі, Германіі, Даніі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Украіны і Расіі была апублікавана серыя карт і высветлены асноўныя фактары неагеадынамічных працэсаў, якія ўплываюць на развіццё тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы. Сярод іх – залажэнне ў сярэднім плейстацэне Усходне-Балтыйскай рыфтавай сістэмы трайнога сучлянення, фарміраванне якой працягваецца і сёння. Вынікі падведзены ў манаграфіях «Неотектоника и неогеодинамика Восточно-Европейской платформы» (2009, разам з Р. Я. Айзбергам і А. К. Карабанавым) і «Сейсмотектоника плит древних платформ в области четвертичного оледенения» (2009, калектыў аўтараў).

Многія працы Р. Г. Гарэцкага прысвечаны вывучэнню разломаў. Ён прымаў актыўны ўдзел у напісанні манаграфіі «Разломы земной коры Беларуси» (2007) пад рэдакцыяй Р. Я. Айзберга. На падставе комплексных геолага-геафізічных даследаванняў разам з Г. І. Каратаевым вылучаны новыя тэктанічныя элементы, якія апісаны ў кнізе «Новые тектонические элементы Восточно-Европейской платформы. Концепции, методы» (2012). Геалагічная інтэрпрэтацыя геафізічных палёў з прымяненнем сучасных метадаў мадэлявання паказала, што Фенаскандынаўскі, Сармацкі і Волга-Уральскі сегменты, якія ўтвараюць Усходне-Еўрапейскі кратон, аб'яднаны элементам унікальнай структуры – Слабоцкім тэктона-геадынамічным вузлом трайнога сучлянення. Шырокі спектр асадкава-вулканагенных і інтрузіўных фармацый у зонах сучлянення сегментаў зямной кары забяспечвае іх высокі металагенічны патэнцыял, з чым звязаны і перспектывы рудаатоснасці Цэнтральна-Беларускай шоўнай зоны і яе ўплыў на магчымую алмазаноснасць Беларусі (Гарецкий, Каратаев «Шовные зоны Фенноскандии, Сарматии и Волго-Уралии», 2014).

Пастаянная ўвага Р. Г. Гарэцкага да аэра- і космаінфармацыі як спосабаў вывучэння геалогіі і асабліва тэктонікі таксама дала плён: пад яго кіраўніцтвам у 1988 г. была складзена першая «Косматэктанічная карта Беларусі» м-бу 1: 2 000 000, а ў 2012 г. – новая карта м-бу 1: 500 000.

Навукова-арганізацыйная дзейнасць Р. Г. Гарэцкага як віцэ-прэзідэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прыпала на 1992–1997 гг. У гэты час развалу адзінай навуковай прасторы пасля распаду СССР і станаўлення незалежнай дзяржавы Беларусь Радзім Гаўрылавіч разам з іншымі кіраўнікамі акадэміі рабіў усё магчымае для захавання кадраў вучоных і навуковых школ, далейшага развіцця беларускай навукі. Дзякуючы энергічным намаганням Р. Г. Гарэцкага, у Беларускім дзяржаўным універсітэце пасля 30-гадовага перапынку пачалася падрыхтоўка геолагаў. Ён арганізаваў кафедру дынамічнай геалогіі і ў 1995–1997 гг. быў яе загадчыкам, чытаў лекцыі па агульнай геатэктоніцы і па праблемах асадкавых адкладаў Беларусі.

Пры рэарганізацыі НАН Беларусі, якая інтэнсіўна ішла ў 2004–2008 гг. і прывяла да закрыцця адзінай у Беларусі акадэмічнай геалагічнай

установы – Інстытута геахіміі і геафізікі, Р. Г. Гарэцкі і яго паплечнікі па акадэміі намагаліся пераканаць кіраўніцтва ў неабходнасці захавання ў складзе НАН Беларусі інстытута і развіцця фундаментальных даследаванняў у галіне геалагічных навук для забеспячэння развіцця мінеральна-сыравіннай базы і яе рацыянальнага выкарыстання. Глыбокі аналіз стану геалогіі ў краіне зроблены ім у праграмным артыкуле «Проблемы геологического изучения недр Беларуси» (Літасфера, 2010, № 1 (39)).

Шмат увагі Радзім Гаўрылавіч заўсёды ўдзяляў рэдактарскай дзейнасці, будучы членам рэдкалегіі часопіса РАН «Геотектоника», рэдакцыйнага савета міжнароднага часопіса «Геофизический журнал» і рэдкалегіі «Геологічного журналу» (Украіна) і іншых замежных выданняў. Як член рэдкалегіі ён удзельнічаў у падрыхтоўцы «Энцыклапедыі прыроды Беларусі» з 5 тамоў і 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі». Р. Г. Гарэцкі – стваральнік, галоўны рэдактар (1994–2008), потым член рэдкалегіі адзінага ў Беларусі навуковага геалагічнага часопіса «Літасфера», у якім на беларускай, рускай і англійскай мовах друкуюцца артыкулы па фундаментальных і прыкладных праблемах геалогіі, геафізікі, геахіміі, аб карысных выкапнях і іншая інфармацыя. Пад рэдакцыяй Р. Г. Гарэцкага ці пры яго сумесным з іншымі рэдагаванні выйшлі з друку 140 найменняў навуковых выданняў.

Акадэмік Р. Г. Гарэцкі быў выдатным вучоным у многіх галінах геалогіі. Ён аўтар і суаўтар 45 манаграфій і асобных выданняў, удзельнічаў у складанні, рэдагаванні і выданні 50 карт геалагічнага зместу, яго аўтарства пазначана ў больш як 500 навуковых артыкулах.

У Радзіма Гаўрылавіча многа вучняў: больш за 30 геолагаў і геафізікаў пад яго кіраўніцтвам ці пры яго кансультацыі абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Ён быў апанентам амаль 50 дысертацый, больш за 20 з іх – доктарскія. Шмат гадоў Р. Г. Гарэцкі ўзначальваў вучоны савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцях «Агульная і рэгіянальная геалогія», «Геатэктоніка», «Геахімія», «Літалогія», «Геалогія нафты і газу».

У дзейнасці Р. Г. Гарэцкага прыкметнае месца займала папулярызацыя геалагічных ведаў, ён аўтар шматлікіх брашур, артыкулаў, нарысаў і лекцый, сярод іх прысвечаныя гісторыі геалогіі і асобным выдатным дзеячам навук аб Зямлі. Пра свайго навуковага настаўніка напісаў кнігу «Академик Яншин – дорогой мой учитель и друг» (2005).

За поспехі ў развіцці геалагічнай навукі Радзім Гаўрылавіч быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Прэзідыума НАН Беларусі, меў дыпломы гонару, залатыя і іншыя медалі ВДНГ СССР і шмат іншых узнагарод.

Р. Г. Гарэцкі сумесна з Р. Я. Айзбергам, Я. Г. Грыбікам, Г. І. Каратаевым у 2018 г. быў узнагароджаны дыпломам ТОП-10 вынікаў дзейнасці вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў за распрацоўку новых уяўленняў аб палеагеадынамічнай эвалюцыі глыбінных зон зямной кары і верхняй мантыі Прыпяцкага і Дняпроўскага палеарыфтавых нафтагазаносных басейнаў, якія дазваляюць павысіць эфектыўнасць геолагаразведачных работ.

Асаблівае месца ў жыцці Р. Г. Гарэцкага займалі праблемы адраджэння беларускай культуры і мовы, незалежнасці нашай краіны, прысутнасці беларусаў у свеце. Тым самым ён працягваў традыцыі выдатнейшых вучоных і асветнікаў: бацькі Гаўрылы Іванавіча і дзядзькі Максіма Іванавіча Гарэцкіх. З 1990 г. Радзім Гаўрылавіч быў сябрам Рады, а ў 1993–2001 гг. – прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», быў адным з арганізатараў шасці з’ездаў беларусаў свету. Ён быў сябрам Рады Таварыства беларускай мовы Беларускай інтэлігенцыі, Беларускага фонду культуры і іншых, натхняльнікам і арганізатарам штогадовых чытанняў братоў Гарэцкіх. Р. Г. Гарэцкі выступаў як прафесійны пісьменнік (ён сябар пісьменніцкай арганізацыі з 2004 г.), яго пяру належаць кнігі пра трагічны лёс бацькі і дзядзькі («Ахвярую сваім “Я”», 1998; «Браты Гарэцкія», 2008; «Лісты жыцця і кахання», 2013). Ён укладальнік і аўтар некалькіх асобных кніг пра Г. І. Гарэцкага («Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы. Да 100-годдзя з дня нараджэння», 2000; «Гаўрыла Гарэцкі. Выбранае», 2002; «Гавриил Иванович Горецкий», 2012 (у суаўтарстве) і інш.). Пісьменніку Р. Г. Гарэцкаму належыць вынаходніцтва арыгінальнага жанру мастацкай літаратуры, які звязаны з геалогіяй. У гэтым жанры выйшлі дзве кнігі – «Жыццёвы меланж» (2013) і «Апантаны Бацькаўшчынай. Жыццёвы меланж – 2» (2018). Жанр так і называецца – жыццёвы меланж. Як і стракатая горная парода меланж, народжаная ў стрэсавых сітуацыях пры зрухах зямной кары па разломах, так і жыццёвы меланж узнікае пры ўздзеянні чалавека на чалавека, адной супольнасці людзей на іншую, краіны на краіну, прыродных феноменаў і іншых з’яў на жыццё людзей.

Р. Г. Гарэцкі да апошніх дзён плённа працаў галоўным навуковым супрацоўнікам у лабараторыі геатэктонікі і геафізікі Інстытута прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Захопленасць навукай, арганізацыйны талент і высокія чалавечыя якасці прыцягвалі да Радзіма Гаўрылавіча ўсіх, хто ведаў яго і працаваў з ім. Яму былі ўласцівы інтэлігентнасць, аптымізм і добразычлівасць, дэмакратызм, увага да калег, здольнасць бачыць галоўнае ў складаных праблемах. Гарэцкі быў выдатным вучоным і грамадскім дзеячам. Ён актыўна працаваў на карысць роднай краіны, працягваў і развіваў лепшыя традыцыі навукі і грамадскай думкі.

Беларускай геалогіі будзе вельмі не хапаць Радзіма Гаўрылавіча Гарэцкага – выдатнага даследчыка Зямлі, які вылучаўся шырокай эрудыцыяй, надзвычайнай працавітасцю, прынцыповасцю і патрабавальнасцю да сябе. Калегі і рэдкалегія часопіса «Літасфера» вельмі смуткуюць з прычыны сыходу з жыцця Радзіма Гаўрылавіча Гарэцкага, адданага сына зямлі беларускай.

*С. А. Лысенка, У. Ф. Логінаў,*
*А. А. Махнач, А. В. Кудзельскі, Я. Г. Грыбік,*
*С. У. Дзямідава, У. І. Таўсташэеў,*
*В. Г. Жогла, Г. А. Камышэнка,*
*Р. Э. Гірын, Я. А. Кухарык*